# "Відэарадыус БНТУ-2012": яшчэ больш прафесійнасці і шарму

3 12 па 20 лістапада ў Мінску праходзіў VI Міжуніверсітэцкі (Рэспубліканскі) конкурс студэнцкіх відэафільмаў "Відэарадыус БНТУ-2012". Кінавідэафорум па традыцыі быў арганізаваны культурна-асветніцкім і гісторыка-адукацыйным цэнтрам Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэктарата БНТУ і пры ўдзеле кафедры кінатэлемастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Мінскай кінашколы-студыі. Генеральным партнёрам конкурсу выступіў Белінвестбанк.

►►► 16 стар.

◄◄◄ 1 стар.

# “Відэарадыус БНТУ-2012”: яшчэ больш прафесійнасці і шарму

Сёлета ў “Відэарадыусе БНТУ”, які шэсць гадоў назад задумваўся як выключна ўнутрыўніверсітэцкі міжфакультэцкі конкурс, прынялі ўдзел 16 устаноў вышэйшай адукацыі з усіх рэгіёнаў краіны, якія даслалі ў Мінск 76 відэа- і кінастужак. Кампетэнтнае журы на чале з вядомым рэжысёрам, заслужаным дзеячам мастацтваў Рэспублікі Беларусь, загадчыкам кафедры кінатэлемастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзімірам Забелам да фінальнага прагляду і глядацкага галасавання дапусціла 25 фільмаў, прысвечаных дзвюм асноўным тэмам конкурсу “Vivat! Alma mater!” і “Студэнцкая відэапрэм’ера”. Варта заўважыць, што шырокай публіцы на фінальным праглядзе прэзентаваўся ўжо не сыры, а, так бы мовіць, даведзены да ладу відэаматэрыял. Удасканаліць конкурсныя работы аўтарам-пачаткоўцам істотна дапамаглі выпускнікі і выкладчыкі Мінскай кінашколы-студыі, якія праводзілі для студэнтаў майстар-класы, давалі ім прафесійныя парады адносна першапачатковага адзнятага матэрыялу.

20 лістапада ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбыліся дэманстрацыя лепшых чатырох фільмаў (лаўрэатаў трох ступеняў і фільма-ўладальніка гран-пры) і ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў. І прадстаўнікі арганізатараў конкурсу, і члены журы, выходзячы на сцэну віншаваць пераможцаў, не скупіліся на кампліменты ў адрас канкурсантаў і іх крэатыўных твораў. У прыватнасці, Уладзімір Забела гаварыў пра тое, што прафесійны ўзровень конкурсных работ, несумненна, вырас за шэсць гадоў і ўжо ў найбліжэйшы час менавіта аматарскае студэнцкае кіно складзе сур’ёзную канкурэнцыю прафесійнаму беларускаму тэлебачанню. Гучалі і цалкам рацыянальныя прапановы творчай камандзе “Відэарадыуса”, напрыклад, аб тым, каб яна пачала цесна супрацоўнічаць з нядаўна створаным тэлеканалам “Мінск 24 Док”, які, відавочна, быў бы не супраць “круціць” студэнцкія стужкі, рэальна цікавыя для беларускай моладзі. Апошняя ж магла б такім чынам атрымаць нешта накшталт сваёй дзялянкі ў беларускай тэлепрасторы (паўнацэннага маладзёжнага тэлеканала як такога ў Беларусі як не было, так і няма да гэтага часу). Акрамя таго, прадстаўнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Мінскай кінашколы-студыі настойліва раілі канкурсантам больш пільна прыглядзецца да гэтых адукацыйных структур. Уладзімір Забела нагадаў, што сёння на факультэце экранных мастацтваў БДАМ з’явілася значна больш магчымасцей для рэалізацыі маладымі людзьмі сваіх амбіцый у кінасферы. Напрыклад, студэнту БНТУ ці БДУІР, у якім раптам прачнуўся кінарэжысёр ці сцэнарыст, неабавязкова кардынальна ламаць сваю прафесійную кар’еру, кідаючы першую альма-матар і спрабуючы паступіць у акадэмію. Факультэт экранных мастацтваў прапаноўвае завочную форму навучання, двухгадовыя курсы і іншыя зручныя адукацыйныя паслугі для людзей з першай некіношнай адукацыяй. Тое самае можна сказаць і пра Мінскую кінашколу-студыю. Як жывое ўвасабленне паспяховай формулы “спачатку тэхнічная адукацыя, а потым кіношная” са сцэны Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пераможцаў “Відэарадыуса” віншаваў былы выпускнік БДУІР і Мінскай кінашколы-студыі Аляксандр Свішчанкоў. Ён шмат гаварыў пра актуальнасць любой кінаідэі як галоўную перадумову таго, што створаная невядомым рэжысёрам стужка не згубіцца ў сённяшняй размаітай кінапрасторы, і міжволі заўважыў, што сур’ёзна рэжысурай людзі пачынаюць займацца звычайна пасля гадоў 25—30 гадоў — для гэтага найперш патрэбен жыццёвы вопыт.

Ці значыць апошняя заўвага Аляксандра Свішчанкова, што работы, прадстаўленыя на “Відэарадыусе БНТУ”, — усяго толькі студэнцкае непрафесійнае кіно, якому вельмі далёка, напрыклад, да таго ж “Лістапада”? Гэта зусім некарэктнае пытанне. Па-першае, як адзначае начальнік культурна-асветніцкага і гісторыка-адукацыйнага цэнтра БНТУ Іна Туманава, асноўнай мэтай “Відэарадыуса” з’яўляецца ўсё-такі не прафесійная арыентацыя, а арганізацыя вольнага часу студэнтаў — змястоўнага, карыснага і інтэлектуальнага. Па-другое, “Відэарадыус” — гэта найперш студэнцкі погляд на жыццё наогул і на жыццё сваёй навучальнай установы, і менавіта ў гэтым студэнцкім поглядзе ўвесь шарм конкурсных відэаматэрыялаў — тое, чаго ў сваю чаргу ніколі не ўдасца прадэманстраваць і самаму выбітнаму прафесіяналу. Студэнцкае кіно можа быць, відавочна, “сцёбным”, як, напрыклад, паказаная на сёлетнім конкурсе стужка “СтудТБ”, можа быць драматычным (кароткаметражка “13:37”), але, ва ўсякім разе, яно пазбаўлена закарузлых прафесійных цытат і штампаў, скіравана не ў метафарычны, а ў рэальны свет... У гэтым рэальным свеце для маладых удзельнікаў “Відэарадыуса” адкрываецца шмат магчымасцей. Яны яшчэ здольны гэта адчуць.

Дыплом пераможцы “Відэарадыуса БНТУ-2012” у намінацыі “Лепшы мантаж” атрымаў фільм “13:37” (БНТУ, аўтатрактарны факультэт, мантаж Міхаіла Бондара), а ў намінацыі “Лепшы арыгінальны сцэнарый” — фільм “СтудТБ” (БНТУ, прыборабудаўнічы факультэт, сцэнарысты Сяргей Сасноўскі і Дзмітрый Дубовік). Лепшую жаночую ролю, на думку журы, выканала Надзея Ерахавец (фільм “Што б ні здарылася”, БНТУ, архітэктурны факультэт), а лепшую мужчынскую — Аляксей Каханові́ч (фільм “13:37”, БНТУ, аўтатрактарны факультэт).

Прыза сімпатый гледачоў удастоены фільм “СтудТБ” (БНТУ, прыборабудаўнічы факультэт, рэжысёр Антон Захарошка). Найбольшую колькасць галасоў (512) на сайце БНТУ сабраў фільм “У пагоні за сабой” (Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, рэжысёр Ігар Іваноў).

Дыплом III ступені атрымаў фільм “13:37”, II — “СтудТБ”, I — “Што б ні здарылася”.

Гран-пры “Відэарадыуса БНТУ-2012” журы прысудзіла фільму Аляксандра Савухі “Цукерка” (БНТУ, факультэт транспартных камунікацый). Аляксандр і атрымаў пераходны сімвал конкурсу — бронзавую камеру на цыркулі-штатыве вагой 6 кілаграм.

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*